**Аддзел ЗАГС Баранавіцкага гарвыканкама правёў ушаноўванне юбілею сямейнага жыцця сям'і Русак. Уладзімір Уладзіміравіч і Вольга Аляксееўна пражылі ў шлюбе 50 гадоў – «Залатыя юбіляры»**

Зарэгістравалі яны свае адносіны 6 верасня 1969 года ў бюро ЗАГС горада Баранавічы. А пазнаёміліся Уладзімір і Вольга ў 1963 годзе. Ён быў студэнтам, яна – школьніцай. Уладзімір жыў на вуліцы Свяцілаўскай, Вольга — на Кароткай. Злучыў іх выпадак. Бабуля Вольгі была ўдзельнікам вайны, ёй далі пуцёўку ў санаторый пад Гомелем. А ў Гомелі ў Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту вучыўся Уладзімір. Яго папрасілі суправаджаць бабулю ў Гомель. Тады першы раз і пабачылі яны адзін аднаго, але ёй тады было 14 гадоў, а яму 18.

Пасля таго, дарогі маладых людзей разышліся. З другога курса Уладзіміра паклікалі ў армію, дзе ён тры гады служыў у танкавых войсках. Калі Уладзімір у лістападзе 1967 гада вярнуўся ў родны горад, а у снежні Вользе выконвалася 18 гадоў, і яна паклікала Уладзіміра па-суседску на дзень нараджэння. З тых пор яны разам.

Вырасцілі дваіх сыноў і дваіх унукаў.

Сакрэт іх шчаслівага сямейнага жыцця, як кажа Вольга Аляксееўна, знаходзіцца ў тым, што трэба ўмець даравацць, што было, то ўжо прайшло. Нават думкі ў іх ніколі не было аб тым, каб скасаваць шлюб.






АДДЗЕЛ
ЗАПІСУ АКТАЎ
ГРАМАДЗЯНСКАГА
СТАНУ
ОТДЕЛ
ЗАПИСИ АКТОВ
ГРАЖДАНСКОГО
СОСТОЯНИЯ


БЕЛАЯ РУСЬ
